ДУА “Пагост-Загародская сярэдняя школа імя славянскіх асветнікаў Кірыла і Мяфодзія” Пінскага раёна
Аўтар: Саланевіч Ганна Васільеўна, настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Тэлефон: 80299691955

(Распрацоўка вучэбнага занятку па вучэбным прадмеце “Чалавек і свет” у 1 класе)

**Тэма: Змены ў жыцці дзікіх жывёл вясной**

**Мэта:** стварыць умовы для пашырэння і паглыблення ведаў навучэнцаў пра жыццё дзікіх жывёл, пра змены ў іх жыцці вясной.

**Задачы:** фарміраваць уяўленні вучняў пра вясновыя змены ў жыцці дзікіх жывёл, пра ўзаемасувязі ў прыродзе; пашырыць уяўленне аб пералётных птушках, садзейнічаць усведамленню важнасці перыяду гнездавання ў жыцці птушак; ствараць умовы для развіцця пазнавальных працэсаў (увагі, памяці, мыслення) ўменняў устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, фармуляваць пытанні; спрыяць выхаванню беражлівага стаўлення да жывёл.

## Ход урока

**I. Арганізацыйны этап**

**II. Псіхалагічны настрой**

Празвінеў ужо званок,
Пачынаецца ўрок.
Нельга нам, сябры, ляніцца.
У школу мы прыйшлі вучыцца.
Пачынаем наш урок.

**III. Этап актуалізацыі ведаў**

-Наш ўрок цесна звязаны з прыродай.

- Якая цяпер пара года? *(вясна). П*аглядзіце на экран і падумайце, якія малюнкі нам трэба ўзяць, каб апісаць прыкметы вясны.

Слайды 2-3

- А якія вясновыя месяцы вы ведаеце?(сакавік, красавік, май) *(на дошцы малюнкі месяцаў)*




*Вясна святла     Вясна вады     Вясна травы*

- Давайце з вамі пагаворым, што адбываецца ў прыродзе з надыходам вясны?

Слайд 6-7

Паглядзіце на экран. Як звязаны малюнкі на слайдзе  Раскажыце.

Што іх аб'ядноўвае? Якога малюнка не хапае?

- З наступленнем вясны сонца … (паднімаецца ўсё вышэй і вышэй).
- З кожным днём становіцца … (усе цяплей  і цяплей)
- Растае … (снег, лед на рэках)
- Вяртаюцца з поўдня … (пералётныя птушкі)
- На дрэвах … (распускаюцца лісточкі)
- З'яўляюцца першыя … (кветкі: пралескі, цюльпаны, ландышы)
- Ажываюць … (насякомыя).

**IV.  Паведамленне тэмы ўрока.**

Малайцы! А цяпер – у лес вясенні на прагулку
Запрашаю вас пайсці.
Цікавейшага здарэння,
Нам, рабяткі,  не знайсці!
Па лесе гуляць пойдзем,
Многа цікавага пра лясных жыхароў знойдзем.

Даведаемся, якія змены ў жыцці дзікіх жывёл адбываюцца з надыходам вясны

**Зрокавая фізкультхвілінка**

физкультмин. для глаз 222.mp

Слайд 7

**V. Этап засваення новых ведаў і спосабаў дзеянняў**

***Праблемная сітуацыя.***

– На вашых партах ляжаць малюнкі жывёл.  Падумайце, на якія групы можна раздзяляць іх? *(птушкі, насякомыя, звяры)*

Давайце заселім іх у домікі.

**Насякомыя** **Звяры** **Птушкі**

У першы домік  вы засялілі насякомых.

Насякомыя – самая шматлікая група жывёл. Навукоўцам ўжо вядома больш за 1 мільён відаў і кожны год адкрываюцца тысячы новых.

– Якіх насякомых можна ўбачыць у пачатку вясны?

*(Пчол, чмялёў, мурашак, матылькоў – усе яны зімавалі ў шчылінках, пад стрэхамі.)*

Дзе іх можна ўбачыць цяпер?  *(Яны летаюць каля раслін, якія зацвітаюць першымі. А матылькоў і мурашак можна ўбачыць на ствалах бяроз.)*

- Чым жа яны кормяцца? (Мурашы і матылькі вельмі любяць салодкі бярозавы сок.)

Крапіўніца падлятае да бярозы, знаходзіць ранку, з якой выцякае сок і ножкай абавязкова трапляе ў сок. Аказваецца, у гэтых матылькоў “язык” знаходзіцца на ножцы. Вось і спрабуюць яны ежу на смак нагой.

Лімонніца – атрымала назву за ярка-жоўты колер.

*(Падручнік,  с. 50, заданне 1)*

– Каго засялілі ў другі домік?

- Прапаную вам паглядзець фільм пра жыхароў вясенняга лесу.




Звярніце ўвагу на жыхароў нашага доміка і адкажыце:

– Як жа змянілася жыццё жывёл з надыходам вясны? *(Прачынаюцца ад зімовага сну. Гадзюкі, вужы і яшчаркі выпаўзаюць*

*пагрэцца на сонцы, а потым адпраўляюцца на паляванне – шукаць ежу. Зайцы і вавёркі пачынаюць ліняць: густая поўсць робіцца рэдкай, мяняецца афарбоўка)*

**VI. Этап замацавання новых ведаў і спосабаў дзеянняў**

– Прапаную пагуляць у **гульню “Хто гэта”** (Кросэнс)




Паглядзіце ўважліва на картку. На месцы пытальніка схаваўся звер. Каб вызначыць хто гэта, трэба падумаць, як звязаны паміж сабой малюнкі?

*(Воўк, вожык)*

– Як змянілася жыццё вожыка з надыходам вясны? *(Вожык спаў усю зіму, моцна пахудзеў, прачнуўся і адправіўся на паляванне шукаць ежу)*

Гэты звер вядомы ўсім –
І старым, і дзецям:
Футра цёплае на ім,
А завуць … *(мядзведзем)*

– Што ведаем пра жыццё мядзведзя вясной?

***Гульня “Пазнай дзікага звера па апісанні”***

- Рудая, пухнатая, хітрая, хуткая (ліса).
- Белы, баязлівы, даўгавухі, касы (заяц).
- Шэры, галодны, злы (воўк).
- Вялікі, касалапы, буры, нязграбны (мядзведзь).
- Маленькі, калючы (вожык).
- Маленькая, спрытная, шустрая (вавёрка).

Лесная зарядка.mp

**Фізкультхвілінка**

- А цяпер дзеці, я вам прапаную адправіцца ў госці да птушак.
- Адкуль вясной вяртаюцца птушкі?

*(З цёплых краін)*

- Як завуць гэтых птушак?

(*Пералётныя.)*



- Назавіце пералётных птушак?

*(Гракі, стрыжы, ластаўкі, зязюля, буслы, дзікія качкі і гусі , жаўрукі, салаўі і інш.)*

- Што робяць птушкі, вярнуўшыся, дадому?

*(Будуюць гнёзды. Выводзяць птушанят)*

- Якія птушкі прылятаюць першымі вы, даведаецеся, адгадаўшы загадкі.

1.Усіх пералётных птушак чарней,
Чысціць раллю ад чарвей.
Узад-уперад па раллі ўскач.
А завецца птушка***...(грак)***




- Вядома, адкрываюць вясну гракі. Прылятаюць яны яшчэ ў сакавіку, калі ляжыць снег. Першы час гракі адшукваюць корм на размоклых дарогах, шукаюць на палях і лугах мышэй-палёвак. Грак – птушка ўсеядная. Ён з вялікім апетытам есць і жывёльную, і раслінную ежу.

2.На тычцы палац
У палацы спявак
А завуць яго (***шпак)***

- Пасля гракоў прылятаюць шпакі: спачатку прылятаюць самцы, а за імі самкі. Да іх прылёту самцы шукаюць шпакоўню, нярэдка

выселіўшы з хатак вераб'ёў. Уладкаваўшыся, шпак з захапленнем гучна спявае, чакаючы сяброўку.

3.У сінім небе галасок,
быццам маленечкі званок. ***(жаўрук)***

- Ужо ў красавіку гучыць песня жаўрука. Гняздо птушкі знаходзіцца на зямлі. Сярод купін і камянёў, зроблена з сухіх травінак.

4.Прылятае да нас з цяплом
Шлях, прарабіўшы, з доўгім хвастом.
Лепіць домік пад акном
З травы і гліны. (***ластаўка***)

- Ластаўка прылятае да нас у маі, калі з'яўляецца больш насякомых. Сям'я ластавак за лета знішчае каля мільёна розных шкодных насякомых. Па палёце ластаўкі можна вызначыць надвор'е. Калі ластаўка лётае нізка – да дажджу.

5.Не варона, не сініца,
як завецца птушка гэта?
Прымасцілася на суку –
Пачулася ў лесе “Ку-ку!” (***зязюля***)

-Зязюля вяртаецца ў родныя краю ў маі. Гняздо не будуе, птушанят не выседжвае, таму што яна выкарміць іх не зможа. Справа ў тым, што зязюля корміцца вельмі атрутнымі насякомымі і ад такога корму птушаняты могуць загінуць. Таму яна падкідвае яйкі ў чужыя гнёзды.

(Падручнік, с. 51)

**VII.Этап падвядзення вынікаў урока**

В.1 - Дзеці, у вас у кожнага на партах ляжыць сакрэт у канверце. Давайце адкрыем іх і паглядзім што там. Кожны адкрывае свой канверт. Як вы думаеце, што трэба зрабіць? Правільна, сабраць карцінку і расказаць аб той жывёле, якая атрымалася ўсё, што вы пра яго ведаеце.





В.2 – Работа ў сшытку на с. 28, заданне 1.

- Што адбываецца ў жыцці дзікіх жывёл вясной?

- Якія жывёлы вясной прачынаюцца? *(Вожык, мядзведзь, барсук)*

- А якая галоўная падзея адбываецца ў жыцці жывёл? (нараджаюцца дзіцяняты )

- Што вы запомнілі пра дзіцяня вожыка, лісы, ваўка, мядзведзя, зайца, вавёркі?

- Што адбываецца ў жыцці птушак? Што яны робяць вясной?

- Якія пералётныя птушкі прылятаюць першымі?

**VIII**. **Рэфлексія “Сонейка”**

- Дзеці, а цяпер ацаніце сваю работу на ўроку. Калі вам усе было зразумела, даведаліся шмат новага, цікавага, вы задаволены сваёй працай на ўроку, выбірайце вясёлае вясенняе сонека. Калі лічыце, што нешта не атрымалася, то выбіраеце сонейка ўжо па настрою.

Ацэнка работы класа ў цэлым.

- Увесну звяры прачынаюцца ад зімовай спячкі і адпраўляюцца ў пошуках ежы.

1.Мядзведзь адпраўляецца шукаць мурашнікі: мурашнік разрые, раскідае вакол. Лапы паліжа і кладзе на мурашнік. На мядзвежых лапах збіраецца шмат насякомых. Ён іх зліжа і за новай порцыяй цягнецца. Увесну мядзведзь есць усё: ловіць жаб, яшчарак, выкопвае з зямлі цыбуліны і клубні раслін.

2.Барсук сілкуецца і раслінамі, і жывёламі, ён усяедны, але больш аддае перавагу расліннай ежы. Сілкуецца ён грызунамі, жабамі, яшчаркамі, птушкамі і іх яйкамі, насякомымі і іх лічынкамі, дажджавымі чарвякамі, грыбамі, ягадамі, арэхамі і травой.

3.Вожык сілкуецца ў асноўным насякомымі і іх лічынкамі, слімакамі, дажджавымі чарвякамі. З раслін – жалудамі, грыбамі, ягадамі і садавінай.

-З надыходам вясны ў жывёл, якія не ўпадаюць у спячку адбываецца лінька. А якія жывёлы не ўпадаюць у спячку?

- Што такое лінька?

Лінька - гэта прыстасаванне да навакольнага асяроддзі, падрыхтоўка да змены пары года. Жывёлы мяняюць цёплае футра на больш рэдкае. Некаторыя жывёлы ў працэсе ліνькі мяняюць колер сваёй шкуры.

- Якія гэта жывёлы ? (ласка, лісіца, вавёрка, заяц і інш.)

- Якая важная падзея адбываецца ў жывёл вясной? (У дарослых жывёл з'яўляюцца дзіцяняты)

-А зараз я вам раскажу пра дзіцянят дзікіх жывел.

1.Вожыкі нараджаюцца без іголак і сляпыя. Вожычыха-мама накорміць іх сваім малаком і ідзе шукаць сабе ежу.

2.Маленькія медзведзяняты з'яўляюцца яшчэ зімой у бярлозе, у траскучы мароз. Яны маленькія, з рукавічку, і маці яшчэ ў бярлозе корміць іх малаком. Увесну разам з мамай-мядзведзіцай медзведзяняты выходзяць з бярлогі і блукаюць па лесе.

3.У вавёркі ў яе гняздзе бывае чатыры-сем маленькіх сляпых дзіцянят. Вавёрка вельмі клапатлівая маці, яна корміць іх малаком і ахоўвае ад ворагаў. У дупле ваверчанятам не холадна, вавёрка сагравае іх і сцеле ім мяккую подсцілку.

4.У ваўчыцы ваўчаняты з'яўляюцца ў логаве. Пакуль дзеці маленькія, то ваўчыца знаходзіцца побач з імі, а воўк яе корміць. Калі ваўчаняты падрастаюць, то ваўчыца пакідае іх і ідзе на паляванне.

5.У лісіцы ў нары з'яўляюцца 3-6 лісянятаў, але бывае і больш. Выбягаць з нары яны пачнуць тады, калі стануць зрачымі і абрастуць шэрсткай. Лісіца-маці ўважліва сочыць, ці не пагражае хто-небудзь яе дзіцянятам. Пры найменшай небяспецы яе кароткі брэх прымушае лісянят адразу хавацца ў нару.

6.Зайчаняты з'яўляюцца на траве ў неглыбокай ямцы. Ужо ў першы дзень яны могуць рухацца, але нікуды не ўцякаюць, а сядзяць на месцы дзе-небудзь пад кустом. Мама-зайчыха корміць зайчанят адразу пасля нараджэння і пакідае іх на некалькі дзён. Малако пажыўнае і тлустае, таму зайчаняты гэтыя 3-4 дні не галодныя. Затым, калі яны прагаладаюцца, то пачынаюць перасоўвацца, пакідаючы пасля сябе пах. Па гэтым следзе іх хутка знаходзіць мама ці чужая зайчыха і корміць другі раз, а праз некалькі дзён – у трэці раз. Пасля зайчаняты ўжо могуць самастойна есці траўку, сцяблінкі і лісце раслін. Зайчыхі кормяць не толькі сваіх зайчанят, але і чужых. Пакормяць і адразу ўцякаюць, каб не прыцягваць да іх увагі драпежнікаў.

-Чаму жывёлы вучаць сваіх дзіцянят? (Шукаць ежу, хавацца ад ворагаў, паляваць)